# На тым тыдні...

✓ **15 сакавіка** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася **паэтычна-музычная вечарына «Міжмоўе»** ў межах музейнага праекта «Кватэрнік у дзядзькі Якуба». Госцямі ўтульнага Дома песняра сталі дзве маладыя паэткі – Кацярына Ваданосава і Хрысціна Скрыган, якія шмат гадоў ствараюць разам музыку і песні ў музычным гурце.

✓ **15 сакавіка**, напярэдадні Сусветнага дня тэатра, у Літаратурным музеі Петруся Броўкі адбылася **лекцыя «Беларуская драматургія 1920 – 1930-х гг.» Аляксея Стрэльнікава** – тэатральнага крытыка, выкладчыка Беларускага дзяржаўнага ўнівер-сітэта, супрацоўніка Цэнтра эксперыментальнай рэжысуры, кандыдата мастацтва-знаўства.



*А. Стрэльнікаў*

Беларускі тэатр 1920 – 1930-х гг. закрылі, засталіся артыкулы пра спектаклі, дыскусіі, пратаколы абмеркаванняў. У падручніках па гісторыі літаратуры ён пазначаны нярэдка адным абзацам. Імёны драматургаў вядомыя толькі спецыялістам, часта згубленыя нават тэксты п'есаў. Гэта грознае папярэджанне мінулага нам, цяперашнім.

✓ **17 сакавіка** ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі адбылася **трэцяя публічная лекцыя паэта і перакладчыка Андрэя Хадановіча**, зладжаная з удзелам грамадскай кампаніі «Будзьма беларусамі!» Пад час лекцыяў літаратар знаёміць слухачоў са сваімі ўлюбёнымі французскімі і польскімі паэтамі, расказвае пра найважнейшых для сябе беларускіх лірыкаў, асвятляе праблемы мастацкага перакладу вершаў і тэкстаў песень.



*«Цар Давід»*
*(фрагмент працы А. Доўнара)*

✓ **17 сакавіка** ў Віцебску ўпершыню адзначалі **наданне гораду ў 1597 г. Магдэбургскага права**. Ініцыятарам святкавання гэтай даты стаў кіраўнік клуба гістарычнай рэканструкцыі «Варгенторн» Сяргей Бабенка. У гарадской ратушы адбылася лекцыя-экскурсія «Старажытны Віцебск» Леаніда Калядзінскага, адкрытая лекцыя «Магдэбургскае права ў Віцебску», а экскурсію па горадзе зладзіў краязнаўца Мікола Півавар.

✓ **18 сакавіка** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў адкрылася **выстаўка «Прыпавесці» Міжнародных майстар-класаў іканапісу ў Навіцы (Польшча).**

З 2009 г. Таварыства сяброў Навіцы разам з кафедрай сакральнага мастацтва Львоўскай акадэміі выяўленчага мастацтва арганізоўвае ў Навіцы (Малапольскае ваяводства), у цэнтры Братэрства грэка-каталіцкай моладзі «Сарэпта», пленэры для мастакоў, якія абапіраюцца на традыцыі беларускага мастацтва. Прадстаўленыя на выстаўцы працы з'явіліся пад час двухтыднёвага пленэра, у якім удзельнічала сорак мастакоў з Польшчы, Беларусі, Украіны, Літвы і Грузіі.



*Экспазіцыя «Прыпавесці»*

✓ **18 сакавіка** на **рамесніцкім кірмашы «Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня»** можна было пабачыць унікальныя рэгіянальныя тэхнікі вырабу велікодных яек, пальмаў і выцінанкі, што ўнесеныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Майстры з пасёлка Сапоцкін працягваюць даўнюю традыцыю роспісу велікодных яек, на паўночным захадзе Гродзеншчыны ствараюць адметныя велікодныя пальмы. На Навагрудчыне існуе традыцыя ўпрыгожваць жыллё папяровымі ўзорамі – напрыклад, да Вялікадня майстрыхі выразаюць пад кулічы адмысловыя сурвэткі.

✓ **21 сакавіка** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» пачаў працаваць **Міжнародны дабрачынны праект «Трикотажные куплеты – 2016»**, які адкрыўся выстаўкай лапікавага шыцця майстроў з Беларусі, Расіі і Латвіі. Пазней экспазіцыя будзе прадстаўленая ў Гродне, Віцебску, Полацку і іншых гарадах, пасля чаго ўсе працы будуць перададзеныя дзіцячым установам краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ